# V. ПЕДАГОГИКА

## ЭКАЭСТЭТЫЧНАЯ ПЕДАГОГІКА І ФАЛЬКЛОР: МЕТОДЫКА, ПРАКТЫКА, ПЕРСПЕКТЫВЫ

У наш час ідэя гарманізацыі адносін паміж чалавекам і прыродай з'яўляецца адной з прыярытэтных. Навукова-тэхнічны прагрэс палегчыў жыццё чалавека, але адначасова нанёс вялікую шкоду прыродзе, спарадзіўшы экалагічны крызіс. Галоўная прычына ўзнікнення экалагічных праблем бачыцца ў характэрным для сучаснага грамадства спажывецкім тыпе ўзаемадзеяння з прыродай, калі выцясняецца разважлівасць, памяншаецца ўсведамленне шкоды, якая наносіцца прыродзе, што вядзе да празмернай эксплуатацыі біясферы і ў выніку, як лічаць сур'ёзныя навукоўцы, да яе амаль поўнага знішчэння. У гэтых умовах узнікае неабходнасць фарміравання экалагічнай свядомасці маладога пакалення, што, на нашу думку, немагчыма без развіцця эстэтычнага ўспрымання прыроды, якое выключае ўтылітарнае стаўленне да яе. Праблема выхавання асобы, адказнай за існаванне экалагічна ўраўнаважанага асяроддзя, выклікала з'яўленне экаэстэтычнай педагогікі. Яна нараджаецца ва ўмовах дыферэнцыяцыі экалагічнай эстэтыкі і педагогікі, экалогіі культуры і экапсіхалогіі, абгрунтоўваючы арыгінальныя мадэлі выхавання шляхам інтэгравання эстэтычных і экалагічных ведаў. Сутнасць педагагічнага пошуку заключаецца ў распрацоўцы асобнай методыкі, здольнай абудзіць такое эстэтычнае ўспрыманне прыроды ў маладога пакалення беларусаў, калі разам з захапленнем яе прыгажосцю, радасцю, здзіўленнем, замілаваннем з'яўляецца пачуццё адказнасці за яе існаванне, спачуванне ўсяму жывому і безабароннаму, а ўсё разам вызначае якасны экалагічны лад мыслення і паводзін маладога чалавека. Экаэстэтычная педагогіка прапаноўвае такія метадычныя распрацоўкі, аснову якіх складаюць матэрыялы, дзе аб'ектыўнае хараство прыроды

знаходзіць вобразнае мастацкае ўвасабленне. Адзначым працы С. Д. Дзярабы і У. А. Ясвіна [1], Н. Г. Купрыной [2], Э. Ф. Маскалёвай [3], І. І. Ярыты [4] і інш., дзе непаўторнасць і прыгажосць навакольнага свету паказваецца праз выяўленчае мастацтва. Да кінематаграфіі звяртаюцца А. Ю. Ганчарук [5] і Л. К. Шыян [6], каб прадэманстраваць, якім чынам зрокавая інфармацыя спалучаецца з мастацтвам інтэрпрэтацый і суб'ектыўным аўтарскім стылем адлюстравання прыродных аб'ектаў. Вельмі актыўна выкарыстоўваюцца творы мастацкай літаратуры. Як паказалі А. П. Сідзялькоўскі [7], А. К. Шульжэнка [8] і інш., яна каштоўная экалагічнымі ідэямі і тым адмысловым сэнсам, выразнікам якога выступаюць характары і канфлікты, і нават простае засваенне сюжэту, аздобленага аўтарскімі апісаннямі прыроды, дапамагае зразумець веліч і прыгажосць навакольнага свету.

Такім чынам, навучыць чалавека рэагаваць на гармонію прыроды, адчуваць патрэбу ў яе захаванні – найважнейшая педагагічная задача. Гэтае даследаванне скіраванае на вывучэнне напрамкаў і сродкаў фарміравання экаэстэтычнага ўспрымання прыроды ва ўдзельнікаў фальклорных калектываў. Выкладзеная ніжэй методыка была апрабіраваная ў 2010–2018 гг. у аматарскіх фальклорных калектывах «Сунічка» Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Кантакт», «Рамонак» Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Маяк» (г. Мінск), «Медуніца» ДУА «Акцябрскі дзіцячы садок – школа» Кобрынскага раёна. Методыка фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды абапіралася на ўнікальны педагагічны вопыт трансляцыі і засваення беларускага спеўнага і танцавальна-гульнёвага фальклору айчынных педагогаў І. М. Грамовіч [9], В. В. Калацэя [10], М. А. Козенкі [11], Т. А. Пладуновай [12], Л. Л. Ражковай [13] і інш. Асаблівае значэнне для распрацоўкі методыкі мелі працы айчыннага даследчыка А. М. Ненадаўца [14; 15], прысвечаныя вывучэнню архаічных поглядаў народа на прыродны свет.

Экаэстэтычнае выхаванне дзіцячых аматарскіх фальклорных калектываў – гэта складаная цэласная сістэма, накіраваная, па-першае, на арганічнае засваенне, спасціжэнне і аднаўленне фальклорнай спадчыны, а па-другое, на фарміраванне ва ўдзельнікаў эстэтычнага светаўспрымання. Асноўныя напрамкі дзейнасці – пазнавальны, канцэртна-выканальніцкі, рэкрэацыйна-асветніцкі.

Пазнавальны напрамак прадугледжвае знаёмства з асаблівасцямі матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага народа, практычнае вывучэнне традыцыйнай народна-песеннай творчасці Беларусі, яе рэгіянальных асаблівасцей. Заўважана, што далучэнне да яе каштоўнасцей спрыяе фарміраванню эстэтычнага ўспрымання прыроды. Мы падкрэсліваем, што да вытокаў эстэтычнай культуры нашых продкаў вядуць мастацкі дасканалыя эпітэты лірычных песень. Для

беларускага народа сонца краснае, месячык ясны, звёзды дробныя, хмара цёмная, ягады буйныя, лес цёмны, рэчка быстрая, лозачка ніцая, зязюля шэрая, дуброва зялёная, пясочак жоўценькі, дзерава звонкае, трава шаўковая і г. д. Паэтычныя карціны прыроды пашыраюць досвед асобы аб духоўным і працоўным жыцці беларускага народа, яго светапоглядзе, эстэтычных ідэалах. Яны непрыкметна ўплываюць на выпрацоўку імпрэсійнага погляду на навакольны свет і ўласных адносін да прыроды ў адпаведнасці з законамі меры, гармоніі і прыгажосці. Паралельна адбываецца засваенне іншых жанраў народнай творчасці – прыказак, прымавак, легенд, паданняў, казак.

Вялікая ўвага надаецца авалоданню навыкамі народнай манеры спеваў, знаёмству з танцавальна-гульнёвым і музычна-інструментальным фальклорам. Зыходнымі тут з’яўляюцца веды, якія спрыяюць разуменню законаў эстэтычнага пераўтварэння прыродных рэалій у мастацкія вобразы. Развіццё ўмення аргументаваць уласныя эстэтычныя ацэнкі і меркаванні адбываецца праз панарамнае засваенне жывой прыроды. Напрыклад, падкрэсліваецца, што ў песенных творах сімвалічны сэнс набываюць вобразы, якія бяруцца менавіта з расліннага і жывёльнага свету. Дарэчы, іх пералік падаў вядомы беларускі паэт і фалькларыст Ніл Гілевіч у сваёй кнізе «Паэтыка беларускай народнай лірыкі» (1975). Так, ён адзначае, што «мясцовая беларуская флора прадстаўлена ў песеннай сімволіцы такімі раслінамі, як каліна, рабіна, вярба, бяроза, вішня, ружа, канапелька, яблынька, пралесачка, сасна, ліпа, ялушачка, рута-мята, явар, дубочак, хмель, трава і інш.; фаўна – амаль выключна птушкамі, такімі як сокал, селезень і вутачка, голуб і галубка, пава, зязюлька, перапёлачка, ластаўка, галка, салавей, арол, каршун, лябедзька і лябёдушка, курачка, цяцерка, чайка, апрача таго, з жывёльнага свету сустракаюцца пчолка (вельмі часта), собаль, куня (куніца), рыбанька, мядзведзь і інш.» [5, с. 78].

У мэтах развіцця эстэтычнага ўспрымання прыроды намі былі прадугледжаныя разнастайныя формы работы, накіраваныя на паглыбленне і пашырэнне ведаў у галіне міфалагічнага светаўспрымання беларусаў, вывучэнне традыцыйнай каляндарнай народна-песеннай творчасці, яе рэгіянальнай адметнасці і жанравай шматстайнасці. Засваенне асноўных ведаў з каляндарна-абрадавага фальклору, звязаных з прыродай, вядзе да ўсведамлення яго самабытнасці і эстэтычнай каштоўнасці. Для гэтага быў удакладнены змест заняткаў і вызначаныя пэўныя тэмы для правядзення гутарак і паведамленняў, згодна з якімі быў падабраны і сістэматызаваны разнастайны і даступны для вывучэння матэрыял. На занятках былі выкарыстаныя творы вусна-паэтычнай творчасці (жарты, замовы, казкі, легенды, паданні і інш.) [6; 16].

Трэба адзначыць, што працэс фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды сродкамі фальклору ўключае тры паслядоўныя этапы,

заснаваныя на логіцы руху ад пазнання эстэтычнай сутнасці фальклору, якое прадугледжвае назапашванне пэўнай сукупнасці ведаў аб дадзеным культурным феномене, да іх актуалізацыі ў канцэртна-выканальніцкай і рэкрэацыйна-асветніцкай дзейнасці. У змястоўным плане цэласнасць педагагічнаму працэсу надаюць сумесная дзейнасць, супрацоўніцтва і сутворчасць яго суб'ектаў – педагога і выхаванцаў, што, безумоўна, спрыяе найбольш поўнаму развіццю і творчай самарэалізацыі асобы ў адпаведнасці з высокімі духоўна-эстэтычнымі ідэаламі беларускага народа. Напрыклад, паведамленне «Паэтычныя погляды нашых продкаў на прыроду» суправаджалася праглядам кінафільмаў З. Я. Мажэйкі «Голоса веков» (Беларусьфільм, ВА «Летапіс», 1979) і «Пранясі, Божа, хмару» (Беларусьфільм, ВА «Летапіс», 1990), расповедам народнага жарту «Прыроду не пераможаш» (в. Бярдовічы Слонімскага р-на Гродзенскай вобл.), праслухоўваннем і развучваннем жніўных песень «Вецяр вея, сонца грэя» (в. Шутавічы Смаргонскага р-на Гродзенскай вобл.), «Перагані, Божа, хмарку» (в. Ахонава Дзятлаўскага р-на Гродзенскай вобл.), «А заспорыў Дунай з морам» (в. Зачэпічы Дзятлаўскага р-на Гродзенскай вобл.).

Пры разглядзе тэмы «Насякомыя ў беларускім фальклоры» адбываецца знаёмства з легендамі «Чаму павука біць нельга (Уцёкі ў Егіпет)» (в. Бярдовічы Слонімскага р-на Гродзенскай вобл.), «Чаму асіна трасецца, зязюля куе, а павука забіваць нельга» (в. Хрыса Бярозаўскага р-на Брэсцкай вобл.), «Адкуль пчолы і пчаліная матка» і «Адкуль шэршні» (в. Жытомля Гродзенскага р-на Гродзенскай вобл.), казкамі «Казёл і пчала» (в. Пагост Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл.), «Пчолка і павук» (в. Рамязы Ельскага р-на Гомельскай вобл.), праслухоўваюцца песні «Пчолікі гудуць» з рэпертуару гурта «Тройца», «Да раілася пчолачка» з рэпертуару Н. В. Матыліцкай.

Падчас знаёмства з тэмай «Шанаванне птушак у беларускай традыцыі» апавядаюцца легенды «Адкуль зязюля (Непаслухмяныя дзеці)» (в. Глядавічы Мастоўскага р-на Гродзенскай вобл.), «Чаму ластаўка добра гняздо ўе (Птушыны настаўнік)» (в. Бабічы Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл.), «Адкуль бусел і кот» (в. Байкі Слонімскага р-на Гродзенскай вобл.), «Адкуль жаваранак» (в. Варанілавічы Пружанскага р-на Брэсцкай вобл.), «Буслы з Адама і Евы» (в. Погіры Дзятлаўскага р-на Гродзенскай вобл.) і «Чаму вераб'ёў крыўдзіць нельга» (в. Войстам Смаргонскага р-на Гродзенскай вобл.), казка «Певень і жаронцы» (в. Ізабеліна Астравецкага р-на Гродзенскай вобл.), праслухоўваюцца песні «Да была ў бабкі курка-рабушка» з рэпертуару гурта «Юр'я», «Арёл божья пташка» з рэпертуару Н. В. Матыліцкай, развучваецца веснавая песня «Ой чырачка-пташэчка» (в. Закальное Любанскага р-на Мінскай вобл.) і валачобная песня «Да была ў бабкі курка рабенька» (в. Студзераўшчына Дзятлаўскага р-на Гродзенскай вобл.).

Тэма «Жывёльны свет у міфалагічнай свядомасці нашых продкаў» прадугледжвае знаёмства з легендамі «Чаму сабакі і каты адзін аднаго не любяць» (в. Рэдзігерава Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл.), «Чаму конь ніколі не пад’есць, а каровам і авечкам можна асвечанае даваць» (в. Мачуль Столінскага р-на Брэсцкай вобл.), «Чаму карове асвечанае можна даваць» (в. Камяно Вілейскага р-на Мінскай вобл.), «Чаму павука, сабаку і ката нельга біць, а елку ўпрыгожваюць» (в. Ялова Пружанскага р-на Брэсцкай вобл.), казкамі «Пра ката, лісіцу, ваўка і мядзведзя» і «Каза-дзераза» (в. Баркалабава Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл.), «Зайчыкава хатка» (в. Альхоўка Астравецкага р-на Гродзенскай вобл.), праслухоўванне песень «Кося, мой кося» з рэпертуару гурта «Тройца», «Чаго, лосеньку, чаго, сівенькі» з рэпертуару Н. В. Матыліцкай, развучванне веснавой песні «Вол бушуе, вясну чуе» (в. Ананчыцы Салігорскага р-на Мінскай вобл.).

Паведамленне «Шанаванне зямлі ў традыцыйнай культуры Беларусі» суправаджаецца расповедам легенд «Стварэнне зямлі і неба» (в. Бабічы Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл.) і «Стварэнне і канец свету» (в. Полькавічы Шумілінскага р-на Віцебскай вобл.), праслухоўваннем валачобных песень «Благаславі, маці, вясну заклікаці» (в. Гарэнічы Бярэзінскага р-на Мінскай вобл.), «Гаспадарочак, слаўны паночак» (в. Аношкі Лепельскага р-на Віцебскай вобл.) і праглядам кінафільма З. Я. Мажэйкі «Рух зямлі» (Беларусьфільм, ВА «Летапіс», 1999).

Падчас знаёмства з тэмай «Водная стыхія ў міфалогіі Беларусі» звяртаемся да легенд «Адкуль русалкі» (в. Мяшэтнікі Мастоўскага р-на Гродзенскай вобл.) і «Свіцязянка» (в. Любанічы Карэліцкага р-на Гродзенскай вобл.), казкі «Сварлівае балота» (в. Казацкія Балсуны Веткаўскага р-на Гомельскай вобл.), праслухоўваем песні «На граной нядзелі русалкі сядзелі» з рэпертуару гурта «Юр’я», «Правяду русалку» і «Рэчанька» з рэпертуару гурта «Тройца», развучваем траецкія песні «На гранавай нядзелі русалкі сядзелі» (в. Закальное Любанскага р-на Мінскай вобл.), «Правяду, правяду русалачку да бору» (в. Вялікі Бор Хойніцкага р-на Гомельскай вобл.).

Гутарка на тэму «Шанаванне расліннага свету старажытнымі беларусамі» ўключае чытанне легенд «Адкуль асіна (Праклятая дачка)» (в. Ізабеліна Астравецкага р-на Гродзенскай вобл.), «Чаму асіна трасецца, а пад елку ў час навальніцы хавацца можна (Уцёкі ў Егіпет)» (в. Маркуны Астравецкага р-на Гродзенскай вобл.), «Чаму калядную елку нельга выкідваць у двор» (в. Вулька-1 Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл.), «Адкуль кветка півоня» (в. Стары Шклоў Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл.), расповед былічкі «Як папараць-кветка ў хадакі ўпала» (в. Парэчча Слонімскага р-на Гродзенскай вобл.), праслухоўванне песень «Яблынь мая» з рэпертуару гурта «Тройца», «Балада пра явар і бярозу» з рэпертуару Н. В. Матыліцкай і мае працягам развучванне

траецкіх песень «Ой, бяроза белая» (в. Раеўшчына Маладзечанскага р-на Мінскай вобл.), «Ой, у боры сосна» (в. Ананчыцы Салігорскага р-на Гомельскай вобл.), купальскіх песень «Чырвоная ружа» (в. Багатырская Полацкага р-на Віцебскай вобл.), «Чаму барок не званок» (в. Ухвішча Полацкага р-на Віцебскай вобл.).

Пры разглядзе тэмы «Вобраз змяі і вужа ў беларускім фальклоры» распавядаюцца легенды «Чаму змеі распаўсюдзіліся» (в. Сталюгі Лепельскага р-на Віцебскай вобл.), «Каго Ной не ўзяў у каўчэг» (в. Вулька-1 Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл.), «Чаму вуж на жываце поўзае» (в. Талькаўцы Ваўкавыскага р-на Гродзенскай вобл.), «Чаму гады па свеце распаўсюдзіліся» (в. Рог Салігорскага р-на Мінскай вобл.) і «Вуж ратуе каўчэг» (в. Жмурна Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл.), казка «Змей-круль і мова жывёл» (в. Маркуны Астравецкага р-на Гродзенскай вобл.), замова «Ад укусу гадзюкі» (в. Дзяражычы Лоеўскага р-на Гомельскай вобл.).

Прапанаваныя гутаркі і паведамленні спрыяюць лепшаму ўспрыманню ўвасобленых у творах фальклору прыродных аб’ектаў, іх асэнсаванню як прыгожых і выразных. Так ствараюцца ўмовы для ўсведамлення самабытнасці, эстэтычнай каштоўнасці традыцыйнай культуры беларускага народа, раскрыцця яе багацця і ўнікальнасці, выхавання пачуцця павагі да культурнай спадчыны. Падчас знаёмства з фальклорнымі творамі (казкамі, песнямі, легендамі) дзеці далучаюцца да мастацкага свету прыроды. Задача палягае ў тым, каб праз фальклор дапамагчы ім уявіць цудоўныя куточкі нашай Радзімы, выклікаць жаданне ацаніць сілу паэтычных метафар і ўвасабленняў, запомніць найбольш выразныя з іх: напрыклад, пра сізую галачку, што выносіць залатыя ключы, замыкае халодную зімачку і адмыкае цёплае лецечка; пра месяц на небе, які выбраў сабе «зёздачку» яснейшую за сябе; пра рэчачку слезавую, якая разлілася там, дзе дачушка з матулькай разышлася, а засталіся кудравая бярозачка, што вырасла там, дзе яны пастаялі, і садовая яблынька, дзе яны пасядзелі. Для дэманстрацыі фальклорных твораў на занятках выкарыстоўваліся этнаграфічныя запісы і прыклады сучаснай інтэрпрэтацыі фальклору ў выкананні прафесійных музыкантаў.

Нягледзячы на ўсе намаганні, распрацоўшчыкі методыкі сутыкнуліся з праблемай, добра знаёмай кіраўнікам дзіцячых фальклорных калектываў: неразуменнем аўтэнтычнага выканання народных песень. На жаль, многія дзеці ніколі не чулі народных песень, асабліва ў натуральным выкананні, таму ў іх даволі абмежаваныя слыхавыя ўяўленні. Як правіла, іх цікавіць папулярная музыка, што негатыўна адбіваецца на ўспрыманні народных песень: падлеткі не ўспрымаюць фальклорны твор свядома, не разумеюць яго мову, не могуць выразіць да яго сваё стаўленне. Гэта галоўная прычына па-

вярхоўнага засваення зместу фальклорнай адзінкі. Як вынік падчас выканання народных песень падлеткі дэзарыентуюцца, што адмоўна ўплывае на іх эстэтычнае развіццё. Каб гэтага не адбывалася, намі былі выкарыстаныя прыёмы актывізацыі эстэтычнага ўспрымання народных песень, якія дапамагалі ўдзельнікам аматарскіх фальклорных калектываў зразумець характар фальклорных твораў і глыбока засвоіць змест.

Звычайна эстэтычнае ўспрыманне народных песень уключае тры этапы: эмацыянальны, аналітычны і творчы. Эмацыянальны этап – гэта пачуццёвае знаёмства з песняй. Для актывізацыі ўвагі дзяцей перад праслухоўваннем неабходна паставіць праблемнае пытанне, змест якога можа мяняцца, напрыклад: «Калі ласка, паспрабуйце вызначыць, калі – зімой, вясной, летам ці восенню – выконвалася гэта песня?», «У час якога свята, на вашу думку, можа гучаць гэта песня?», «Якія паэтычныя вобразы прысутнічаюць у гэтай песні?». Такія пытанні стымулююць пазнавальны інтарэс, ажыўляюць увагу ўдзельнікаў калектыву, настройваюць на свядомае ўспрыманне твора. Выразнае, каларытнае выкананне песні заўсёды выклікае эмацыянальны водгук, які дапамагае спасціжэнню адмысловай эстэтыкі, духоўнасці і гармоніі, закладзенай у змесце народнай песні.

Першапачатковае эстэтычнае ўражанне – падстава для аналізу твора на другім этапе, аналітычным, калі эстэтычныя эмоцыі становяцца аб’ектам роздуму, ацэнкі. Асаблівае значэнне варта надаваць аналізу мастацкіх асаблівасцей народнай песні, яе жанравай спецыфіцы. Вывучэнне розных праяў традыцыйнай беларускай культуры, свят беларускага календара, міфалогіі, знаёмства з побытам старажытных беларусаў набліжаюць да ўсведамлення паэтычных фарбаў фальклору, што значна пашырае дыяпазон эстэтычнага ўспрымання народнай песні, спрыяе засваенню яе сэнсавага і сімвалічнага падтэксту. Напрыклад, падчас знаёмства з купальскай песняй «Шла купалка па вуліцы» (в. Ананчыцы Салігорскага р-на Мінскай вобл.) мэтазгодна разабраць наступныя пытанні: «Што гэта за свята – Купалле?», «Навошта ў купальскую ноч трэба “пільнаваць” жыта?», «Якія купальскія легенды і паданні вы ведаеце?» і інш. Адказваючы на пытанні такога тыпу, дзеці спасцігаюць эстэтычную сутнасць паэтычных тэкстаў народных песень і пачынаюць глыбока адчуваць эмацыянальны настрой фальклору, рацыянальна ўсведамляць яго. Гэта пашырае моўную рэпрэзентацыю эмоцый, якія выражаюцца праз пэўныя паэтычна-вобразныя словазлучэнні, выкарыстанне тэрмінаў, што ўжываюцца для апісання ўспрынятых сюжэтаў і паэтычных вобразаў.

Заўважана, што на творчым этапе дзякуючы асэнсаванню мастацкай сутнасці фальклорнага твора ў выхаванцаў пачынаюць нараджацца ўласныя эстэтычныя меркаванні, у якіх выяўляюцца не толькі па-

пярэднія эмоцыі, але часам даволі выразнае каштоўнаснае стаўленне да народнай творчасці. З'яўляецца здольнасць аднаўляць цэласную мастацкую карціну прыроды на падставе ўласных асацыяцый праз параўнанне са з'явамі рэчаіснасці, з вобразамі іншых твораў фальклору або сумежных мастацтваў. Паступовае ўзбагачэнне эстэтычнага ўспрымання не толькі фальклорных твораў, але і вобразна адлюстраваных у іх прыродных аб'ектаў метадычна апраўдвае сябе. Крок за крокам абуджаючы думкі і пачуцці сваіх выхаванцаў, педагог раскрывае перад імі ўнутраныя сувязі фальклорнага мастацтва з асобнымі з'явамі прыроднага наваколля, у выніку чаго яны пачынаюць адчуваць і ўсведамляць эмацыянальны сэнс эстэтычных абагульненняў.

У дзейнасці фальклорных калектываў значнае месца адводзіцца развучванню і выкананню аўтэнтычных песень. Далучэнне выхаванцаў да сапраўдных народных спеваў і непарыўна знітаваных з імі ў побыце гульняў, рухаў, побытавых танцаў – эфектыўны шлях да пашырэння эстэтычнага кругагляду. Для фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды асабліва важна, каб дзеці былі цалкам ахопленыя прыгажосцю каляндарна-абрадавай песні. Напрыклад, веснавой, дзе хлопец просіцца ў бярозкі начаваці, тая адказвае яму, што няма дзе, а ён пераконвае дрэўца словамі-параўнаннямі: «Я высплюся у бярозкі на лісточку, на лісточку, // Як у роднай матулячкі пры бачочку, пры бачочку. // Я высплюся у бярозкі на сучочках, на сучочках, // Як у роднай матулячкі на ручочках, на ручочках. // Я высплюся ў бярозачкі на карэннях, на карэннях, // Як у роднай матулячкі на каленях, на каленях». Песня, зразумела, мае сімвалічны сэнс, але хараство карціны прыроды, створанае спалучэннем выразных слоў, гукаў, музычных інтанацый, параўнанне чалавечага і прыроднага, матулі і бярозкі, пакідае эмацыянальны адбітак. Для параўнання другая веснавая песня, дзе апісанне начлегу ў сімвалічнай частцы выклікае жахлівае ўражанне. Ялушачка адказвае, чаму яна не зялёная: «А пада мной начлежнікі начавалі, начавалі, // На карэнні сіні агонь раскладалі, раскладалі. // Яны маё карэнейка папалілі, папалілі, // Яны ж маё і вецейка пасмалілі, пасмалілі. // Яны мяне, ялушачку, засушылі, засушылі» (в. Альсевічы Мядзельскага р-на Мінскай вобл.). Эмацыянальнае стаўленне дзяцей да пазначаных карцін прыроды сведчыць таксама аб ступені развіцця іх экалагічнай свядомасці.

Асаблівае патрабаванне экаэстэтычнай методыкі – вывучэнне каляндарна-абрадавых твораў згодна з прыроднымі цыкламі і адпаведнымі порамі года: зімовыя песні – зімой, летнія – летам, восеньскія – восенню, веснавыя – вясной. Такі падыход актывізуе эстэтычную думку асобы, праецыруе мастацкія аналогіі і асацыяцыі на прыродны свет. Засваенне эстэтычнага зместу каляндарна-абрадавай песні немагчыма без расшыфроўкі і тлумачэння незразумелых

удзельнікам аматарскага фальклорнага калектыву дыялектных слоў і словазлучэнняў. Акцэнтаванне ладава-інтанацыйнай і метрарытмічнай будовы музычнай мовы, мнагапланавага і асацыятыўнага зместу паэтычных формул дапамагае падлеткам адчуць цэласнасць, глыбіню і гармонію спачатку мастацкіх твораў фальклору, а потым і навакольнага асяроддзя.

Эстэтычны вобраз народнай песні ствараецца не толькі словам і музыкай, але і ўсім абліччам выканаўцаў, тэмбрам голасу, манерай спеваў.  Намі былі вылучаныя спецыяльныя заняткі, на якіх народная песня засвойваецца як феномен вуснай традыцыі шляхам шматразовага праслухоўвання этнаграфічных запісаў і самастойнага аднаўлення песні ў адпаведнасці з фальклорным узорам, на падставе еднасці моўных (дыялектных асаблівасцей, спосабаў гукаўтварэння і артыкуляцыі) і музычных (метрарытмічных і ладава-інтанацыйных) характарыстык. Згодна з этнафоназнаўчым падыходам варта дамагацца абсалютнай дакладнасці вымаўлення дыялектных асаблівасцей народнай песні не як скажэння беларускай літаратурнай мовы, а як крыніцы жывой гаворкі, якая з’яўляецца інтанацыйнай базай для ўзнікнення меладычнага багацця беларускай песеннасці. Слова, прамоўленае ў дыялектнай форме, з уласцівай яму інтанацыяй, становіцца асновай для фарміравання спеўнай пазіцыі. Пры гэтым базай для максімальна дакладнага прайгравання фанетычных асаблівасцей з’яўляюцца казкі, быстрамоўкі, лічылкі, дражнілкі і інш. Таксама важна вывучаць музычна-стылявыя заканамернасці, уласцівыя пэўнаму рэгіёну. Рэгіянальны характар маюць тэмбравыя характарыстыкі гука, ладавыя асаблівасці, палірытмія музычнай тканіны, розныя спецыфічныя выканальніцкія прыёмы (вібрата, мелізмы, глісанда і інш.), асаблівасці харэаграфіі і г. д. Варыянты аднаго і таго ж напеву, запісаныя ў розных вёсках, могуць даць уяўленне пра яго тыповыя заканамернасці, пры гэтым неабходна паказаць, што кожны варыянт захоўвае сваю каштоўнасць і ўнікальнасць. Праслухоўванне і аналіз усіх магчымых варыянтаў узбагачае слыхавы досвед удзельнікаў фальклорных калектываў і дазваляе паспяхова выкарыстоўваць яго на практыцы. Спалучаючы шматразовае слуханне этнаграфічнага выканання народнай песні са спробамі ўласнага капіравання, падлеткі захоўваюць моўныя інтанацыі, інтуітыўна шукаюць свае варыянты ў адпаведнасці з канкрэтнай сітуацыяй, жыццёвым кантэкстам. Такі спосаб навучання народным спевам садзейнічае далучэнню падлеткаў да творчасці на аснове мясцовых традыцый, пашырае іх уяўленні аб народнай музычна-паэтычнай мове, дазваляе адчуць і ўвасобіць у сваім выкананні атмасферу бытавання фальклору, што спрыяе найбольшаму пагружэнню ў фальклорную культуру, узбагачае эмацыянальны свет, выхоўвае любоў да роднага краю.

Вялікае значэнне для эксперыментальнай работы мела наведванне рэспубліканскіх этнаграфічных канцэртаў «Фальклор беларускай глыбінкі» ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, знаёмства ўдзельнікаў аматарскіх фальклорных калектываў з творчасцю аўтэнтычных выканаўцаў твораў народнага мастацтва (песень, танцаў, казак, карагодаў, інструментальнай музыкі). Арганізуючы гэтую работу, мы зыходзілі з даўно вядомых сведчанняў збіральнікаў фальклору аб тым, што паўнавартаснае эстэтычнае ўздзеянне фальклорны твор аказвае толькі падчас яго жывога аўтэнтычнага выканання і непасрэднага ўспрымання ад носьбітаў. Незвычайная прыгажосць фальклорных твораў, узмоцненая натуральнасцю трансляцыі, усведамленне сваёй роднасці з тымі, хто некалі жыў і выконваў гэтыя творы, аказвала незабыўнае ўражанне на падлеткаў, адкрывала новыя эмоцыі, асацыяцыі, нараджала гарманічныя структуры, драматургічныя камбінацыі і г. д. Прамое ўспрыманне аўтэнтычных спеваў пашырала жыццёвы і эстэтычны вопыт удзельнікаў аматарскіх фальклорных калектываў. Жывое выкананне, як можна было заўважыць, павышала цікавасць да ўспрымання фальклорных твораў «з вуснаў», а непасрэдныя стасункі з носьбітамі фальклору ўзбагачалі творчае жыццё калектываў, спрыялі выхаванню павагі да вясковых людзей, абуджалі жаданне берагчы і працягваць мастацкія традыцыі Беларусі.

Рэкрэацыйна-асветніцкі напрамак мае на мэце наведванне ўдзельнікамі фальклорных калектываў экскурсій, выстаў народнай творчасці, канцэртаў, удзел у краязнаўчых вандроўках. Аб’ектамі нашай экскурсійнай дзейнасці з’яўляліся як прыродныя, так і культурныя помнікі, ландшафты, дзе культура і прырода выступаюць у непарыўным адзінстве. Удзельнікі аматарскіх фальклорных калектываў падчас эксперыментальнай працы неаднаразова здзяйснялі падарожжы да святых крыніц, а таксама ў Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту (пас. Азярцо Мінскай вобл.).

Падчас правядзення экскурсій дзецям было прапанавана знайсці ў жывой прыродзе пэўныя з’явы і ўласцівасці, якія адлюстраваныя ў разгледжаных і развучаных на мінулых занятках празаічных творах вусна-паэтычнай творчасці (у прыказках, прымаўках, загадках, прыкметах, павер’ях, казках, легендах, паданнях і г. д.). Непасрэднае ўспрыманне прыродных аб’ектаў, іх суаднясенне з мастацкімі вобразамі прыроды і ацэнка апошніх як крыніцы глыбокіх эстэтычных перажыванняў і пачуццяў спрыяюць гарманізацыі, умацаванню, а часам і аднаўленню парушанай раўнавагі адносін дзяцей да прыроды.

Падчас вандроўкі з удзельнікамі эксперыментальнай групы да святой крыніцы ў мікрараёне Вяснянка (вул. Крупцы) найбольш актыўным выхаванцам было прапанавана выступіць у ролі экскур-

саводаў, падрыхтаваць разгорнутыя паведамленні на тэму «Паданні і павер'і беларусаў пра крыніцы». Пазнаёміўшыся з паданнямі пра крыніцу ў в. Мінеўшчына Ваўкавыскага р-на Гродзенскай вобл., пра «Усцінаву крыніцу» ў в. Валосавічы Чачэрскага р-на Гомельскай вобл., «Мядзведжую крыніцу» ў в. Шарсцін Веткаўскага р-на Гомельскай вобл., крыніцу ў в. Драгунова Расонскага р-на Віцебскай вобл., крыніцу «Дзявічы калодзеж» у в. Захарнічы Полацкага р-на Віцебскай вобл., павер'ямі пра крыніцу «Кіпячка» каля в. Арэшкавічы Пухавіцкага р-на Мінскай вобл., крыніцу «Кіпучка» ў в. Барталамееўская Рудня Чачэрскага р-на Гомельскай вобл. і інш., дзеці даведаліся, што ў Беларусі святыя крыніцы раней называлі прошчай (ад слова «прашэнне»), бо ў такія мясціны звычайна прыходзілі сяляне і прасілі адпушчэння грахоў, паратунку ад хваробы, дапамогі ў бядзе, а маладыя дзяўчаты на выданні – добрага, працавітага жаніха. Сяляне верылі, што духі вады, дрэў могуць дапамагчы, таму аддзячвалі ім: у ваду кідалі грошы, на галінках дрэў развешвалі ручнікі, навязвалі стужкі.

Незабыўнае ўражанне на ўдзельнікаў фальклорных калектываў аказвае экскурсія ў Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту (пас. Азярцо Мінскай вобл.). Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту – гэта ўнікальны і адзіны на ўсю краіну музей-скансэн пад адкрытым небам, дзе сабраныя помнікі народнага дойлідства з розных гісторыка-этнаграфічных куткоў Беларусі. Унікальнасць музея заключаецца ў тым, што ён дазваляе сутыкнуцца з сапраўднымі творамі традыцыйнай культуры Беларусі і гэтым аказвае вялікае ўздзеянне на інтэлектуальную, эмацыянальную і маральную сферы асобы, актывізуе асабісты вопыт, стымулюе эстэтычнае стаўленне да навакольнай рэчаіснасці. Экспанаты музея – узоры тыповых вёсак Цэнтральнай Беларусі, Паазер'я і Падняпроўя XIX – пачатку XX ст. Помнікі народнай архітэктуры арганічна ўпісваюцца ў ландшафт зямельных участкаў, які адпавядае мясцоваму рэльефу паказаных рэгіёнаў. Ля сялянскіх хат растуць клёны, ліпы, бярозы, знаходзяцца крыжы, студні, шпакоўні, вуллі – усё, як некалі было ў тым ці іншым рэгіёне. Асобна адзначым, што музей пад адкрытым небам – гэта не проста сховішча экспанатаў, а маляўнічы куток прыроды, дзе на велізарнай плошчы паказана прыблізна 43 % ад усёй айчыннай флоры. Акрамя таго, тут знаходзяцца і важныя прыродаахоўныя аб'екты – рака Пціч з Воўчкавіцкім вадасховішчам і рака Менка.

Экскурсія ў Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту дазволіла выхаванцам пазнаёміцца з узорамі традыцыйнай культуры Беларусі, садзейнічала набыццю новых ведаў пры непасрэдным назіранні прадметаў і з'яў у цэласнасці натуральнага выгляду, што мае вялікае значэнне для развіцця эмацыянальнага і пазнавальнага свету асобы. Наведванне музея прадвызначыла ў падлеткаў

адказнае стаўленне да нацыянальнай спадчыны, узмацніла цікавасць да традыцыйнай культуры, матэрыялізаванай у музейных экспанатах, якія ўяўляюць гістарычную, культурную і эстэтычную каштоўнасць. Дзеці даведаліся, як нашы продкі выбіралі дрэва для будоўлі, у якую пару і на якім месцы будавалі хату, якія лекавыя расліны ўжывалі і якія дрэвы садзілі ля хат. Выхаванцы ўбачылі і адчулі непаўторную прыгажосць асобных ландшафтаў, раслін, наведалі помнік археалогіі Гарадзішча, курганныя могільнікі. Такія стасункі з жывой прыродай глыбока закранаюць пачуцці і розум дзяцей, абуджаюць эстэтычныя перажыванні, патрэбнасць суаднесці паводле падабенства вобразы прыроды з узвышанымі якасцямі чалавека, дабром, справядлівасцю, ісцінай.

Канцэртна-выканальніцкі напрамак прадугледжвае актыўны ўдзел аматараў у канцэртах і конкурсах, фестывалях, шэсцях і масавых святах, падчас якіх можна прадэманстраваць свой узровень разумення фальклорнай традыцыі, уласнае выканальніцкае майстэрства, набыць неабходны для яго ўдасканалення сцэнічны вопыт. Асноўная мэта – даць выхаванцам магчымасць пашырыць кругагляд, упэўніцца ў сваіх сілах, адчуць радасць ад агульнага далучэння да самабытнай нацыянальнай спадчыны, атрымаць асалоду ад мастацкай працы, параўнаць вынікі сваёй мастацкай творчасці з вынікамі работы аднагодкаў.

Вялікае значэнне для фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды мае ўдзел у традыцыйных каляндарна-абрадавых святах, якія праводзяцца ў натуральных прыродна-ландшафтных умовах. Педагагічнае ўздзеянне каляндарных абрадаў узмацняецца дзякуючы закладзеным у іх разнастайным відам народнага мастацтва. Спевы, танцы, гульні, карагоды паўстаюць не проста як аб’ект эстэтычнага ўспрымання і выканання, а як імпульс для разгортвання святочнага сюжэта, як пэўная мадэль і эстэтычны ўзор паводзін у прыродным асяроддзі. Сінкрэтычнае спалучэнне слоў, танцавальных рухаў, жэстаў і мімікі, багатай палітры музычных інтанацый, гукаў і фарбаў прыроднага свету стварае ўмовы для найвышэйшага перажывання эстэтычных эмоцый і пачуццяў, нараджае пачуццё любові да прыроды і адказнасці за яе лёс. Назапашванне станоўчых уражанняў, іх далейшая сістэматызацыя на рэпетыцыях значна актывізуюць мастацка-творчую дзейнасць членаў калектыву, уплываюць на фарміраванне эстэтычных матываў паводзін. Знаёмства з творчасцю іншых аматарскіх і вучэбных фальклорных калектываў робіць педагагічны працэс больш цікавым і змястоўным.

Аматарскія калектывы эксперыментальнай групы штогод прымаюць удзел у такіх традыцыйных каляндарных святах, як «Каляда, каляда, дай, баба, пірага» (Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы, Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Кола-

са), «Масленіца – белы сыр» (Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту), Гуканне вясны (Цэнтральны дзіцячы парк імя М. Горкага), Юр’я (Цэнтральны батанічны сад НАН Беларусі), Вялікдзень (Цэнтр пазашкольнай работы «Кантакт»), Зялёныя святкі (Цэнтральны дзіцячы парк імя М. Горкага), Купалле (Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту) і інш.

Перад кожным святам кіраўнікі і ўдзельнікі эксперыментальных калектываў рыхтуюць разгорнутыя паведамленні на вызначаныя тэмы і неабходны для выканання музычны матэрыял.

На рэпетыцыях, прысвечаных святу «Каляда, каляда, дай, баба, пірага», дзеці разглядалі тэму «Каляды – свята зімовага сонцастаяння», развучвалі песні «Прыйшла Каляда ўвечары» (в. Ананчыцы Салігорскага р-на Мінскай вобл.), «А талды, талды, зарадзі, Божа» (в. Янова Веткаўскага р-на Гомельскай вобл.), «Го-го-го, каза» (в. Тонеж Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл.), «Ходзіло-блудыло сэмсот малойцэв» (в. Клятная Пінскага р-на Брэсцкай вобл.), «Ой, у Кіяве, ніжэй каменя» (в. Дывін Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл.), «В Рожэство Хрыстово», «Ой, учора з вечора» (в. Запясочча Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл.), «Добры вечар табе, пане-гаспадару» (в. Морач Клецкага р-на Мінскай вобл.), удзельнічалі ў калядных гульнях «Яшчур» (Барысаўскі р-н Мінскай вобл.) і «Жаніцьба Цярэшкі» (Віцебская вобл.).

У межах работы над святам «Масленіца – белы сыр» была разгледжана тэма «Масленічныя святкаванні», развучаныя песні «На вуліцы дзеўкі гуляюць» (в. Толпіна Чашніцкага р-на Віцебскай вобл.) і «Мы па жэрдаццы йдом» (в. Барталамееўка Веткаўскага р-на Гомельскай вобл.).

Вялікая работа была праведзена падчас падрыхтоўкі абраду Гуканне вясны. Падлеткі разглядалі тэму «Традыцыі гукання вясны на Беларусі», развучвалі песні «Агу, вясна, агу, красна» (в. Букча Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл.), «Вол бушуе, вясну чуе» (в. Ананчыцы Салігорскага р-на Мінскай вобл.), «Вясна, вясна на калочку» (в. Закальное Любанскага р-на Мінскай вобл.), «Вясняначка» (в. Казацкія Балсуны Веткаўскага р-на Гомельскай вобл.).

Падрыхтоўка абрадавага свята Юр’е патрабавала разгляду тэмы «Юр’е на двары – кароўку ў поле гані», вывучэння песень «Да мы Юр’я пачынаем» (в. Ахонава Дзятлаўскага р-на Гродзенскай вобл.), «Юр’я, устань рана» (в. Дуброва Пастаўскага р-на Віцебскай вобл.).

Да абрадавага свята Вялікдзень падлеткі развучылі песні «На Вялікадня да на першы дзень» (в. Горкі Чэрвеньскага р-на Мінскай вобл.), «Борам, борам, баравінкаю» (в. Губіна Уздзенскага р-на Мінскай вобл.), «А й Ніначка» (в. Маставуха Полацкага р-на Віцебскай вобл.), «Ды ў канцы сяла ды стаяла верба» (в. Вострава Слонімскага р-на Гродзенскай вобл.) і «А з-пад лесу, лесу цёмнага» (в. Жорнаўка Бярэзінскага р-на Мінскай вобл.).

Працуючы над абрадам Зялёныя святкі, падлеткі даведаліся, адкуль пайшлі назвы Зялёныя святкі, Сёмуха, Тройца, Зелянец, Русальны тыдзень, Граная нядзеля, развучылі песні «Ой, ты, Тройца, што пасееш, той зародзіцца» (в. Чамярын Пінскага р-на Брэсцкай вобл.), «Ой, бяроза белая» (в. Раеўшчына Маладзечанскага р-на Мінскай вобл.), «На гранавай нядзелі русалкі сядзелі» (в. Закальное Любанскага р-на Мінскай вобл.), «Правяду, правяду русалачку да бору» (в. Вялікі Бор Хойніцкага р-на Гомельскай вобл.).

Рыхтуючыся да святкавання Купалля і купальскага вечара, падлеткі складалі разгорнутыя паведамленні на тэму «Традыцыі святкавання Купалля ў Беларусі», знаёміліся з легендамі пра папараць-кветку і кветку іван-ды-мар'я, развучвалі песні «Купала, купала, дзе ты прабувала» (в. Багатырская Полацкага р-на Віцебскай вобл.), «У нас сягоння Купалачка» (в. Замошша Чашніцкага р-на Віцебскай вобл.), «Ляцела дзераўцо» (в. Балоціна Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл.).

Традыцыйныя побытавыя танцы кракавяк, полька, «На рэчаньку», падэспан, «Юрачка», лявоніха, гульні «Цяцерка», «Явар», «Падушачка» і іншыя развучваюцца да ўсіх свят.

Пасля правядзення свята на наступных рэпетыцыях набыты вопыт сістэматызуецца і абагульняецца. Асабліва важнае значэнне мае выкарыстанне рэфлексіўных метадаў (самаацэнкі, дыскусій), якія дазваляюць не толькі прааналізаваць назапашаны эстэтычны вопыт («Ці спадабалася свята?», «Якія былі памылкі?», «Якія ёсць прапановы?»), але і атрымаць неабходную для ўдасканалення далейшай працы калектыву зваротную сувязь з выхаванцамі. Публікацыя матэрыялаў у насценным друку, падрыхтоўка фотаздымкаў, правядзенне выніковай канферэнцыі даюць падлеткам магчымасць абмяняцца ўражаннямі, абмеркаваць і крытычна ацаніць як уласную дзейнасць, так і работу іншых выканаўцаў, выказаць свае пажаданні і прапановы.

Такім чынам, распрацаваная намі методыка і практыка фарміравання экаэстэтычнага ўспрымання прыроды ва ўдзельнікаў аматарскіх фальклорных калектываў прадугледжвае ўкараненне ў змест выхаваўчай дзейнасці калектываў канкрэтных ведаў па народнай эстэтыцы, узбагачэнне эстэтычных уражанняў у працэсе непасрэднага ўзаемадзеяння з прыродным асяроддзем. Павышэнне культуры ўзаемаадносін з прыродай адбываецца праз практычнае засваенне мадэляў эстэтычных паводзін у натуральным прыродным ландшафце. Добрыя вынікі дае спалучэнне выхаваўчых магчымасцей успрынятых дзецьмі паэтычных фальклорных вобразаў і практычна засвоеных прыгожых песенных твораў з пазнаннем экалагічных поглядаў нашых продкаў, камбінаванне атрыманых на занятках ведаў, уменняў і навыкаў з рэкрэатыўнымі момантамі творчага жыцця ўдзельнікаў калектыву.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. *Дерябо С. Д., Ясвин В. А.* Экологическая психология и педагогика. Ростов н/Д, 1996.

2. *Куприна Н. Г.* Эколого-эстетический подход в художественном воспитании детей : дис. … д-ра пед. наук : 13.00.01. М., 2008.

3. *Москалева Э. Ф.* Формирование эстетического отношения младших школьников к окружающему миру : автореф. дис. … канд. пед. наук : 13.00.02 / Ульян. гос. пед. ун-т. Ульяновск, 2007.

4. *Ярыта І. І.* Формування естетичного сприйняття природы в дітей молодшого шкільного віку : автореф. дис. … канд. пед. наук : 13.00.01 / Луган. держ. пед. ун-т ім. Т. Шевченка. Луганськ, 2001.

5. *Гончарук А. Ю.* Педагогические условия развития отношения школьника к действительности средствами зрелищных искусств : дис. … д-ра пед. наук : 13.00.01. М., 2000.

6. *Шиян Л. К.* Акмеологические основы овладения организаторами киновидеопропаганды педагогическими технологиями эстетического воспитания молодежи средствами теле- и видеопрограмм : автореф. дис. … д-ра пед. наук : 19.00.13 / Рос. акад. гос. службы при Президенте Рос. Федерации. М., 1995.

7. *Сидельковский А. П.* Психологические основы отношения школьников к природе. М., 1987.

8. *Шульженко А. К.* Эколого-эстетическое воспитание молодежи в европейской и отечественной педагогике : дис. … д-ра пед. наук : 13.00.01. М., 2006.

9. *Грамовіч І. М., Снапкова Л. В.* Методыка работы з фальклорным гуртам. Мінск, 2009.

10. *Калацэй В. В.* Каранёвы светапогляд этнасу і этнаэкалагічны патэнцыял традыцыйнай культуры // Традыцыйная культура і дзеці. Праблема этнавыхавання : матэрыялы III Рэсп. навук.-практ. канф., г. п. Акцябрскі, 19–20 крас. 2006 г. / уклад. М. А. Козенка. Мінск, 2006. Вып. 2. С. 16–19.

11. *Козенка М. А.* Праблемы захавання і развіцця мастацкіх традыцый Гомельскай вобласці // Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва : навук.-інфарм. зб. / Нац. б-ка Беларусі. Мінск, 1993. Вып. 3. С. 22–32.

12. *Пладунова Т. А.* Рухомы фэст «Па святах “Сонечнага крыжа”: сацыяльны запыт і канцэпцыя // Штудыі рэспубліканскай сезоннай фальклорнай школы / уклад.: В. В. Калацэй. Мінск, 2007. С. 22–26.

13. *Ражкова Л. Л.* Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў сродкамі фальклору ў аматарскіх мастацкіх калектывах : дыс. … канд. пед. навук : 13.00.05. Мінск, 2007.

14. *Ненадавец А. М.* Каму пакланяліся продкі / навук. рэд. А. С. Фядосік. Мінск, 1996.

15. *Ненадавец А. М.* Стварэнне Сусвету (Зямлі) паводле беларускай міфалогіі // Міфалогія. Духоўныя вершы / пад рэд. А. С. Фядосіка. Мінск, 2003. С. 13–49.

16. Беларуская «народная Біблія» ў сучасных запісах / уступ. арт., уклад. і камент. А. М. Боганевай. Мінск, 2010.